# Паэтычныя творы для немаўлят

### ( першы год жыцця)

Паэтычнае слова спрадвеку выкарыстоўваецца ў выхаваўчых і дыдактычных мэтах. Знаёмства дашкольнікаў з беларускай паэзіяй пачынаецца ад самага нараджэння. Паводле народнай традыцыі, першыя ўздзеянні на ўспрымальную душу дзіцяці на ўзроўні мастацтва ажыццяўляюцца з дапамогай фальклорных твораў.

Калыханкі, забаўлянкі, прыгаворкі, песенькі – вось тыя дасканалыя мастацкія формы фальклору з дапамогай якіх адбываецца знаёмства з мастацкім гучаннем твора, багаццем і разнастайнасцю навакольнага свету. Менавіта малыя вершаваныя формы фальклору , па зазначэнні К. І. Чукоўскага, складаюць разумовы пажытак дашкольнікаў, далучаюць дзіця да асноў народнага маўлення. Цэлая гамма пачуццяў – захаплення, пяшчоты, задавальнення – перапаўняе гэтыя творы. Эмоцыі радасці, даверу, перакананасці ў станоўчым закладзены ў самой іх пабудове. Вершаваныя жанры фальклору ўяўляюць сабой расфарбаваныя яскравыя славесныя карцінкі, якія састаўляюць свет штодзённых уяўленняў дзіцяці.

Знаёмства дзіцяці з вершаванымі фальклорнымі формамі пачынаецца з калыханак. Матчына ”песня неўміручай любві да дзіцяці” дапамагае заспакоіць малога незвычайнай меладычнасцю і павольным, размераным рытмам мовы. Пяшчотнае выкананне дарослым калыханкі спрыяе

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ўстанаўленню паміж ім і дзіцём шчырых узаемаадносін, паступова вядзе немаўля да ўспрымання чалавечага голасу як сігналу зносін. Узмацненню эмацыянальнага кантакту паміж дарослым і дзіцём спрыяюць моўныя асаблівасці калыханкі – гукавая сіметрыя, паўторы. Напоўненая пяшчотай і лірызмам калыханка з'яўляецца першай прыступкай, па якой пачынаецца ўзыходжанне дзіцяці да мастацтва слова, выхавання паэтычнага слыху. Разам з тым калыханкі гэта своеасаблівая народная псіхатэрапія. Іх мяккае гучанне заспакойвае дзіця, улагоджвае і закалыхвае яго.

Знаёмства дашкольнікаў з калыханкамі дапамагае ў далейшым наладжваць гульні з лялькамі, дзе дзіця ў час закалыхвання лялькі самастойна выконвае пяшчотную песеньку .

**А ты , коцінька-каток...**

А ты , коцінька-каток,
Ў цябе шэранькі хвасток.
Ты прыходзь к нам начаваць,
Будзеш Янку калыхаць,
А я шэраму катку
За работу заплачу –
Дам гарлачык малака
І кавалак пірага.

**Баю- баінку, баю..**

Баю- баінку, баю,
Не лажыся на краю,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Не лажыся на краёк,

Прыйдзе шэранькі ваўчок,

Прыйдзе шэранькі ваўчок

Ён ўсхопіць за бачок...

**Люлі, люлі, люлі...**

Люлі, люлі, люлі,

Ўсе дзеткі паснулі.

Адна мая ляля

Не спіць, не гуляе,

З катком размаўляе.

**Каток шэры, каток шэры...**

Каток шэры, каток шэры,

Прыбяжы да нас у сені.

Будзеш у нас начаваць

І дзіцятка калыхаць.

**Ах ты , коцік, мой каток...**

Ах ты , коцік, мой каток

Ў цябе шэранькі хвасток.

Прыйдзі ў хату начаваць,

Маю Волечку качаць.

**Пайшоў коцік на таржок...**

Пайшоў коцік на таржок

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Купіў Юрку піражок,

Пайшоў коцік на вулку,

Купіў Юрку булку.

Пайшоў коцік рэпку рваць,

Юрку трэба крэпка спаць.

**Люлі-люлі, люляшу...**

Люлі-люлі, люляшу,

Я дзіцятка калышу,

Нітачку звіваю

Песеньку спяваю.

**А..., а..., люлі, а..., а..., люлі,**

А..., а..., люлі, а..., а..., люлі,

Спі, сыночак міленькі,

Галубочак сізенькі,

Мой сыночак будзе спаць,

А я буду калыхаць.

**Ходзіць певень па капусце...**

Ходзіць певень па капусце,

Носіць сон у белай хустцы.

Усенькім дзецям прадаваў,

А Ганульцы дарма даў.

**Люляю-люляю...**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Люляю-люляю,

Я коціка налаю,

Каб ён да нас не хадзіў,

Цябе , дзетка, не збудзіў,

А ты, каток , пайшоў вон,

А дзетачцы аддай сон.

Ходзіць сон каля вакон,

А дрымота каля плоту,

І пытае сон дрымоту:

-- Дзе мы будзем начаваць?

-- Дзе хацінка цяпленька,

Дзе хацінка маленька.

**Апсік, апсік, каточак...**

Апсік, апсік, каточак,

Не хадзі ты ў садочак,

І не тапчы кветачак,

І не будзі дзетачак,

Няхай кветачкі цвітуць,

Няхай дзетачкі заснуць.

Люлі, люлі, дзеткі , спаць,

А я буду калыхаць.

**Люлі-люлі-люленькі...**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Люлі-люлі-люленькі,

Прыляцелі гуленькі,

Селі яны ў люленькі,

Сталі яны гуркатаць,

Дзіцятачка калыхаць.

Маўчы, маўчы, не крычы.

**Люлі-люлі-люлі...**

Люлі-люлі-люлі,

Усе дзеткі паснулі,

Адна мая ляля

Не спіць, не гуляе,

Не спіць , не гуляе,

З катком размаўляе.

У працэсе дагляданння дзіцяці дарослыя не могуць абысціся без, так названай, паэзіі пеставання. У час кармлення, купання малога дзіцяці актыўныя дзеянні дарослага, суправаджаюцца невялікімі па памеры вершаванымі прыгаворамі, пястушкамі. Гэтыя прыгаворы носяць у большай ступені гумарыстычны характар, тым не менш яны з'яўляюцца вельмі значнымі для дзіцяці. Немаўля ўслухоўваецца ў гукі паэтычнай мовы пястушак, улаўлівае іх рытм, асобныя гукаспалучэнні і пступова пранікае ў іх сэнс.

Так, ставячы малога на ножкі, маці прыгаворвае:

Дыбкі, дыбок,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Скора Міхасіку – гадок!

Купанне дзіцяці суправаджаецца наступнымі вершаванымі радкамі:

З гуся вада,

З Петруся худоба.

З гуся вада,

З Петруся худоба.

Пагладжваючы хворае месца ў малога, матуля прыгаворвае:

У сарокі балі,

У вароны балі,

У Алёнкі зажыві.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ